*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 19 (489) | Серада, 16 мая 1962 г. | Цана 1 кап.

## *У лабараторыях універсітэта*

*У шматлікіх лабараторыях універсітэта заўсёды вядзецца вялікая навуковая і вучэбная работа: студэнцкі і аспіранцкі калектыў вывучае праблемы той ці іншай галіны навукі і тэхнікі, адкрывае новае, яшчэ невядомае нікому.*

*Сёння мы публікуем некалькі здымкаў Э. Дамарацкага, якія ён зрабіў у некаторых лабараторыях універсітэта для нашай газеты.*



*На здымку: супрацоўнікі радыёхімічнай лабараторыі Кананюк, Гілевіч, Самаль за работай.*

# Іду́ць экзамены

Студэнты 3 курса юрыдычнага факультэта здалі ўжо ўсе чатыры экзамены: гісторыю Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (экзамен прымаў выкладчык Аляксей Мітрафанавіч Малашка), крымінальны працэс (выкладчык — Сяргей Пятровіч Бякешка), грамадзянскае права (выкладчык — Васілій Фёдаравіч Чыгір), грамадзянскі працэс (выкладчык — Іосіф Аляксандравіч Юхо).

Лепш, чым іншыя прадметы, студэнты здалі экзамены па грамадзянскаму працэсу. Тут выдатныя адзнакі атрымалі 22 студэнта, і толькі шасцёра здалі гэты экзамен на «тройкі».

На ўсіх чатырох экзаменах паказалі выдатныя веды трэцякурснікі Аляксандр Знаешаў, Уладзімір Камоза, Уладзімір Каравай, Міхаіл Пятачэнка, Іван Сяргеенка. Ніжэй сваіх магчымасцей адказвала В. Яфімава, якая атрымала ўсе чатыры здавальняючыя адзнакі; Л. Лебедзеў і Е. Пісьяукаў маюць у сваім арсенале толькі па адной «чацвёрцы».

Цяпер у трэцякурснікаў юрыдычнага факультэта пачынаецца вытворчая практыка ў народных судах і органах пракуратуры рэспублікі.

**Л. СЯНЮТА,**
**студэнт 5 курса юрфака.**

●

Чацвёрты курс біялагічнага факультэта таксама перад ад'ездам на вытворчую практыку здаваў экзамены. Праўда, на адзін менш за юрыстаў. Асабліва бліскуча чацвёртакурснікі здалі апошні экзамен па спецкурсу: з 49 чалавек выдатныя адзнакі атрымалі 24, столькі ж студэнтаў паказалі добрыя веды, і толькі адна здавальняючая адзнака псуе такі добры выгляд экзаменацыйнай ведамасці.

●

Пачалася летняя экзаменацыйная сесія і на геаграфічным факультэце. Студэнты чацвёртага курса ўжо здалі два экзамены, на якіх яны паказалі добрую падрыхтоўку. Экзамен па дыялектычнаму матэрыялізму прымаў выкладчык Аркадзь Іванавіч Ляўко, экзамен па эканамічнай геаграфіі краін народнай дэмакратыі—Сцяпан Максімавіч Мельнічук. Па абодвух прадметах выдатныя адзнакі атрымалі В. Баранаў, М. Ланкевіч, Л. Бяспалава, П. Рогач і іншыя.

**І. ЛЯСКОЎСКІ.**

## УМАЦОЎВАЕЦЦА СУВЯЗЬ КАФЕДРЫ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭКАНОМІІ З ВЫТВОРЧАСЦЮ

У канцы красавіка кафедра палітычнай эканоміі правяла цікавае пасяджэнне выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта сумесна з наватарамі вытворчасці, вынаходнікамі, рацыяналізатарамі, эканамістамі і інжынерамі завода аўтаматычных ліній, трактарнага, станкабудаўнічага імя Кірава, электратэхнічнага заводаў і іншых прадпрыемстваў горада. Сустрэча была прысвечана пытанням тэхнічнага прагрэсу. Гэта нарада была цікавай як для студэнтаў, так і для прадстаўнікоў прадпрыемстваў.

Уступнае слова зрабіў намеснік загадчыка кафедры палітычнай эканоміі дацэнт Андрэй Пятровіч **Скуман.**

На пасяджэнні выступіў старшы інжынер-эканаміст СКБ-8 Уладзімір Міхайлавіч **Пейсаховіч.** Ён падзяліўся сваімі думкамі аб далейшым развіцці і эканамічнай эфектыўнасці ўкаранення ў вытворчасць аўтаматычных ліній. Тав. Пейсаховіч расказаў аб рабоце сваіх калег над стварэннем аўтаматычных ліній і агрэгатаў, над укараненнем у вытворчасць новай тэхнікі. Выконваючы заказы прадпрыемстваў, СКБ робіць эканамічны разлік, каб кожны рубель капіталаўкладанняў даваў належны эканамічны эфект.

Начальнік падрыхтоўкі кадраў трактарнага завода Аляксей Цярэнцьевіч **Чалышкоў** расказаў аб сістэме падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, а таксама інжынерна-тэхнічных работнікаў на заводзе.

Галоўны канструктар электратэхнічнага завода Віктар Аляксеевіч **Хабараў** падзяліўся сваімі меркаваннямі аб выпуску электратэхнічнай прадукцыі для абсталявання буйнейшых электрастанцый краіны.

Наватар вытворчасці, член брыгады камуністычнай працы гэтага ж завода Віктар Аляксеевіч **Чуеў** расказаў аб сваёй рабоце ў брыгадзе.

Такія сустрэчы з вытворчасцю кафедра арганізуе не ўпершыню. Асабліва актыўна працуюць у гэтым напрамку работнікі кафедры і кабінета палітычнай эканоміі Андрэй Пятровіч Скуман, Андрэй Цімафеевіч Базылеў, Андрэй Яфімавіч Бураўскі і іншыя.

Пажадана такія нарады рабіць часцей, тэматыку браць больш праблематычную, абмяркоўваць, можа быць, кожны раз асобную праблему, але больш грунтоўна.

**Н. ЯРАВІКОЎ,**
**загадчык кабінета палітычнай эканоміі.**

## *У лабараторыях універсітэта*



*Студэнты чацвёртага курса біялагічнага факультэта Аксана Каспарава і Станіслаў Гаўрылаў шмат часу аддаюць навуковай рабоце. Вельмі цікавая галіна біялогіі—вывучэнне водарасляў. На здымку: А. Каспарава і С. Гаўрылаў у лабараторыі гідрабіялогіі.*

## Лепшай прызнана насценгазета біёлагаў

Ва універсітэце праходзіў агляд насценных газет і бюлетэняў усіх факультэтаў, прысвечаны 50-годдзю з дня аснавання газеты «Правда» і Дню друку.

Першае месца журы агляду прысудзіла насценнай газеце біялагічнага факультэта **«За мичуринскую биологию»** (рэдактар Т. М. Міхеева), якая рознабакова асвятляе жыццё факультэта, цікавая па зместу, прыгожая па афармленню.

Другое месца падзялілі насценныя газеты матэматычнага факультэта **«Решим любую задачу»** (рэдактар Л. П. Прымачук) і фізічнага факультэта — **«За науку»** (рэдактар Н. М. Хаўратовіч).

На наступным месцы — газета філалагічнага факультэта **«Слова філолага»** (рэдактар Б. П. Міцкевіч).

Загадам рэктара універсітэта прафесара А. Н. Сеўчанкі рэдкалегіі насценных газет «За мичуринскую биологию», «Решим любую задачу», «За науку» і «Слова філолага» узнагароджаны грашовымі прэміямі. Рэдактары гэтых газет узнагароджаны Ганаровымі граматамі рэктарата і парткома універсітэта.

Загадам рэктара, у сувязі з святкаваннем 50-годдзя газеты «Правда» і Дня друку, грашовымі прэміямі ўзнагароджаны дзевяць найбольш актыўных карэспандэнтаў шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт». Сярод іх — Яўген Казюкін, студэнт 1 курса аддзялення журналістыкі, Генадзь Праваловіч, студэнт 2 курса аддзялення журналістыкі, Леанід Сянюта, студэнт 5 курса юрыдычнага факультэта, Канстанцін Іскра, аспірант матэматычнага факультэта, і іншыя.

26 актыўных карэспандэнтаў насценных газет факультэтаў узнагароджаны граматамі рэктарата і парткома універсітэта. У тым ліку — Л. Анісаў (геафак), Г. Браніцкі (хімфак), Г. Навіцкі (фізфак) і іншыя.

## *У лабараторыях універсітэта*



*Вельмі адказная частка ў вучэбнай рабоце аспірантаў — навуковая работа ў лабараторыях. Асабліва шмат даводзіцца працаваць у лабараторыях аспірантам хімічнага, фізічнага і іншых факультэтаў. Не дзіўна таму, што аспірантi хімічнага факультэта Ларыса Навіцкая і Валянціна Мяшкова, якіх вы бачыце на гэтым здымку, заўсёды прападаюць у лабараторыі аналітычнай хіміі.*

## Па універсітэту

*7—8 мая ў Мінску праходзіла тэарэтычная канферэнцыя работнікаў вышэйшых навучальных устаноў горада. На канферэнцыі разглядалася пытанне арганізацыі вучэбнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах у святле рашэнняў XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.*

*У рабоце секцый грамадскіх навук, гуманітарных і мастацтвазнаўчых навук, фізіка-тэхнічных, матэматычных і хімічных навук, біялагічных і медыцынскіх навук разглядаліся канкрэтныя праблемы, якія стаяць зараз перад выкладчыцкім складам ВНУ,—праблемы выхавання студэнцтва, сувязі выкладання вызначаных навук з жыццём, з практыкай камуністычнага будаўніцтва.*

□

*Закончылася размеркаванне маладых спецыялістаў, выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Амаль пяцьсот выхаванцаў усіх васьмі факультэтаў пакідаюць сёлета сцены ўстановы, каб прыкласці свае сілы там, дзе патрабуе ад іх Радзіма.*

□

*5 мая споўнілася 50 гадоў дацэнту, кандыдату фізічных навук Георгію Васільевічу Авечкіну, аднаму з вядучых выкладчыкаў фізічнага факультэта. Выкладчыцкі і студэнцкі калектыў факультэта, грамадскасць усяго універсітэта горача павіншавала юбіляра. Адзначаючы заслугі Георгія Васільевіча Авечкіна ў развіцці фізічнай навукі, рэктарат Белдзяржуніверсітэта ўзнагародзіў яго Ганаровай граматай.*

□

*Студэнты 2 курса аддзялення журналістыкі выпусцілі чарговы нумар сваёй вучэбнай газеты «Журналіст» на мінскім гадзіннікавым заводзе. Прадпрыемства — адно з лепшых у рэспубліцы, вядомае далёка за межамі Беларусі і нават краіны. Яго прадукцыя вельмі своеасаблівая, цікавая. Галоўнае, людзі працуюць на ім выдатныя. Таму і прысвяцілі журналісты-другакурснікі выпуск сваёй газеты жыццю гадзіннікавага завода.*

*Выпускам газеты кіравалі выкладчыкі кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку Е. Л. Бондарава і Н. А. Сніцарава.*

## У заалагічным музеі



Ля стэнда з новымі экспанатамі.

# Два дні ў Кіеве

— Зноў Кіеў? Летась ужо «з'ездзілі»! І яшчэ разок не перашкодзіць,— прабурчэў песіміст.

Аптымісты разважалі інакш:

— Абавязкова пакатацца па Дняпры, паглядзець Аскольдаву магілу, абыйсці ўсе магазіны, купіць тое-сёе, забегчы туды-сюды... Наогул, трэба збірацца.

— Калі хоць адзін чалавек не прыйдзе на рэпетыцыю, ніхто нікуды не паедзе, — папярэджвалі свае калектывы кіраўнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

«Адзін чалавек», вядома, не прыходзіў, і ўсё ж мы паехалі. І калі цягнік даў «традыцыйны» гудок, а перад вокнамі вагонаў павольна праплылі і засталіся ззаду апошнія будынкі Мінска, нават песіміст павінен быў перакапацца, што на гэты раз мы ўсё ж пападзем у Кіеў.

Хто такія «мы»?

Мы — гэта каля 200 чалавек, удзельнікаў народнай харавой капэлы універсітэта, танцавальнага гуртка, аркестра народных інструментаў.

Ехалі мы да сваіх сяброў, студэнтаў Кіеўскага ордэна Леніна дзяржаўнага універсітэта імя Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі.

І трэба сказаць, што наша самадзейнасць ім спадабалася. Многія нумары выклікаліся на «біс». Асаблівым поспехам карысталася песня студэнта філалагічнага факультэта І. Скурко «Доўга чакаў я цябе...», выступленне Віктара Ледзенева, а таксама многія танцы. Наогул, цяжка сказаць, што кіеўлянам спадабалася лепш.

Канцэрт канцэртам. А ўсё ж нам хацелася пазнаёміцца з горадам. Колькі цудоўных водгукаў мы чулі аб ім, аб яго старажытных помніках, каштанах і таполях, аб Дняпры.

Нам пашанцавала: мы прыехалі, калі Кіеў рыхтаваўся сустракаць Першамай. Расквечаны сцягамі, транспарантамі, святочнымі агнямі, горад здаваўся казачным.

І хоць надвор'е было не вельмі добрае — імжэў дождж, рэдка праглядвала сонца, але ў інтэрнаце ніхто не сядзеў. За дні, праведзеныя ў сталіцы Украіны, амаль кожны паспеў пабываць у многіх славутых мясцінах.

Наведалі Сафійскі сабор. Пабудаваны 925 гадоў назад, ён і цяпер здзіўляе наведвальнікаў велiччу, мазаікай і фрэскамі. На жаль, нельга было наведаць Кіеўска-Пячэрскую лаўру — зараз праводзіцца рамонт.

Аскольдава магіла... Адразу ўспамінаюцца цудоўныя хор дзяўчат з оперы Вярстоўскага, хор рыбакоў.

Кіеў — горад помнікаў. Глыбока шануюць украінцы памяць свайго земляка Тараса Шаўчэнкі. Нездарма каля велічнага помніка, які стаіць насупраць універсітэта, заўсёды жывыя кветкі, нездарма універсітэт носіць яго імя, нездарма тапалёвая алея называецца шаўчэнкаўскай. І калі нашы студэнты прыйшлі да помніка, каб пакланіцца вялікаму кабзару, над таполямі ўзнеслася песня, якая такая дарагая сэрцу украінскага чалавека:

«Рэве та стогне Дніпр шірокий...»

І толькі аднойчы нам прыйшлося расчаравацца — калі глядзелі гульню футбалістаў мясцовага «Дынама» і «Жальгірыса» (Вільнюс). Хоць кіеўляне і выйгралі матч з лікам 1:0, ад іх чакалі лепшай гульні.

Кіеўляне — прыветныя людзі. Калі мы сустрэліся з групай юнакоў і тыя даведаліся, што мы з Беларусі, яны сталі нашымі гідамі, расказвалі аб горадзе, знаёмілі з ім.

Мы прабылі ў Кіеве ўсяго два дні. Але нам ніколі на забыць яго, сталіцу братняй Украіны.

**А. НІЧЫПАРУК.**

## ПРЭМ'ЕРА СПЕКТАКЛЯ ЭДУАРДА ДЭ ФІЛІПА

*У суботу ў актавай зале корпуса гуманітарных факультэтаў з вялікім поспехам прайшла прэм'ера п'есы Эдуарда дэ Філіпа ў двух дзеях «Злодзей у раі» (Ніхто), якую ажыццявіў уноў створаны драматычны калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пастаноўшчык спектакля П. Бекіш аддаў шмат часу і энергіі, каб п'еса дайшла да гледача. Выканаўцы галоўных і другарадных роляў асабліва старанна адпрацоўвалі кожны рух, кожнае слова. Гледачы засталіся вельмі задаволены спектаклем.*

*Падрабязную рэцэнзію на спектакль чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў нашай газеты.*

## З канцэртам да воінаў

Студэнты матэматычнага факультэта наведалі сваіх сяброў— воінаў Савецкай Арміі. Яны доўга рыхтаваліся да гэтай паездкі; асабліва хваляваліся адказныя за канцэрт чацвёртакурснікі Ларыса Сілкіна і Уладзімір Хасіневіч. І вось наступіў гэты доўгачаканы дзень. Група самадзейных артыстаў размяшчаецца ў машыне, але месца не хапае. На дапамогу прыходзяць дзве легкавых. Падарожжа цудоўнае — прыемна праехаць па лясных дарогах на адкрытай машыне, падыхаць свежым паветрам. Жарты, песні, вясёлая гамонка...

А 12 гадзіне пачынаецца канцэрт.

Перад воінамі выступае студэнтка 3 курса Валя Краўцова. Яна выконвае песні «Свавольніца» і «Студэнцкі вальс». Потым пяе Іван Сказкевіч (І курс). Зал бурна апладыруе яго майстэрству.

Асабліва спадабалася воінам пастаноўка Янкі Купалы «Прымакі». Удзельнікам драматычнага гуртка шмат прыйшлося папрацаваць, каб гэту пастаноўку ўбачылі гледачы. Не бяда, што на сцэне няма дэкарацый, гэта нікольні не перашкаджае артыстам. Ролю Кацярынкі выконвала першакурсніца Зінаіда Дубоўская, Мацейкі— яе аднакурснік Яўген Чайкоўскі.

Вялікім поспехам у воінаў карысталіся танцоры — выканаўцы народных танцаў: беларускага «Лянка», украінскага «Казака», польскага «Кракавяка» — Клара Трапейка, Тамара Кірбай, Уладзімір Уладзіміраў і Аляксандр Кулібаба.

Канцэрт закончаны.

Позна ўвечары студэнты пакідаюць сваіх сяброў. Развітваючыся, многія запісваюць адрасы новых сяброў; хто яшчэ гутарыць аб нечым, а хто ўжо з неахвотаю ўкладвае інструменты...

На вуліцы дождж. Студэнты жартуюць: «Не гліняныя, не размокнем!». І зноў у машыне песні, жарты, смех. У кожнага на сэрцы весялей удвая ад таго, што ты зрабіў нешта добрае для іншых. Дарэмна так хваляваліся Ларыса Сілкіна і Уладзімір Хасіневіч — усё прайшло ў выключна цёплай абстаноўцы, з удзячнасцю будуць успамінаць воіны і студэнты гэтую сардэчную, сяброўскую сустрэчу.

**І. ТРУХАН,**
**студэнт І курса матфака.**

## Гаворыць інтэрнацкае радыё

*У інтэрнаце № 1, што па вуліцы Свярдлова, пачаў працаваць радыёвузел.*

*Першая яго перадача была прысвечана Дню Перамогі. Перад студэнтамі выступіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны выкладчык кафедры рускай мовы Сямён Осіпавіч Цаленчук. Ён падзяліўся ўспамінамі аб суровых ваенных гадах, прыгадаў свае паходы, незабыўныя сустрэчы з насельніцтвам братніх народаў краін сацыялістычнага лагера, расказаў аб сваіх сябрах-аднапалчанах.*

*Са сваімі вершамі, прысвечанымі нашым слаўным воінам, выступілі маладыя паэты філалагічнага факультэта Уладзімір Верамейчык і Мікола Маляўка. Студэнт 2 курса рускага аддзялення Анатоль Гамолін выканаў дзве песні на словы студэнтаў І курса аддзялення журналістыкі Яўгена Казюкіна і Пятра Сушко.*



Марыя **Петрашкевіч** перавялася на стацыянар з завочнага аддзялення. Сціплая дзяўчына, яна адразу ўлілася ў дружны калектыў другакурснікаў беларускага аддзялення. Моцна пасябравала з Ленай Хімарода.

— Як родныя сёстры,— гавораць аб іх аднакурснікі. І сапраўды, вельмі добра адчуваць моцнае сяброўскае плячо ў жыцці і вучобе.

# КУТОК АДПАЧЫНКУ



## Мара студэнта

**(Са студэнцкага гумару)**

ПРАФЕСАР *(нясмела стукаецца ў дзверы)*: Дазвольце зайсці?

СТУДЭНТ *(пазяхаючы)*: Заходзьце, прафесар.

ПРАФЕСАР *(уваходзячы)*: Добрага здароўя, Пётр Мікалаевіч!

СТУДЭНТ: Добрага здароўя. Сядайце...

ПРАФЕСАР: Ці не маглі б Вы зараз здаць экзамен?

СТУДЭНТ: Гэта будзе залежыць ад Вас.

ПРАФЕСАР: Дзякую. Бярыце, калі ласка, білет. Бярыце, бярыце, я не гляджу... Які ў Вас нумар?

СТУДЭНТ: Трыццаць другі... Ведаеце, прафесар, Вам прыдзецца зайсці ў другі раз.

ПРАФЕСАР: Ну, таварыш студэнт, я Вас прашу...

СТУДЭНТ: Не!

ПРАФЕСАР: Я вельмі прашу.

СТУДЭНТ: Я сказаў — зойдзеце ў другі раз.

ПРАФЕСАР: А калі ў Вас усё ж можна будзе прыняць экзамен?

СТУДЭНТ: Зловіце як-небудзь. Звычайна я бываю на факультэце па чацвяргах.

ПРАФЕСАР: Вялікае дзякуй... Прабачце... *(Выходзіць)*.



**Калі лекцыя нецікавая.** Фотаэцюд Э. Дамарацкага.

ШАХМАТНАЯ ЗАДАЧА

**Я. Ляхаў.**



Мат у 2 хады.

## НЕ ЎСЁ Ў ПАРАДКУ

**Дзед кароў пасе,**
**Дзед дрыжыць ад грому.**
**Верхам на касе**
**Едзе смерць к старому.**

**— Дзе твая радня?...**
**Сабірайся, хворы.**
**Вось табе паўдня**
**Я даю на зборы.**

**— Я б і рады ў рай,**
**Ды не ўсё ў парадку.**
**З добрым зяцем дай**
**Выпіць мне спачатку.**

**Госці пакрысе**
**Цэляцца дадому.**
**Верхам на касе**
**Едзе смерць к старому.**

**— Што ж, касая, рэж,**
**Ды не ўсё ў парадку.**
**Хай нявестка перш**
**Мне спячэ аладку.**

**Сын дачку вязе**
**Бацьку дарагому.**
**Верхам на касе**
**Едзе смерць к старому.**

**— Прэч з вачэй, карга. —**
**Дзед аб стол загрукаў.—**
**А цяпер чарга**
**Пажаніць унукаў.**

**Мікола МАЛЯЎКА.**

### *ПУСТОСЛОВ*

*Когда Данила говорит,*
*Все уверяют: лес шумит.*
*А лес шумит листвой своей,*
*Когда гуляет ветер в ней.*

И. ПЕТРОВ,
2 курс отд. русского языка и литературы.

Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212, тэл. 2-07-19. *Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.* Зак. 1242. АТ 12946.

**За рэдактара П. УДАВІЧЭНКА.**